УДК 902/904

# КРАМЯНЁВЫ ІНВЕНТАР З ПОМНІКА БЕРАЖАНЫ (ГРОДЗЕНСКІ РАЁН, ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ)

**Жабінская С. С.**
Установа адукацыі
"Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы"
(г. Гродна, Рэспубліка Беларусь)
Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін ГрДУ імя Я. Купалы
А. Дз. Гаршкоў

Анатацыя. Помнік Беражаны быў адкрыты ў 1909 г. Хутчэй за ўсё ён размяшчаецца на нізкай тэрасе левага берага р. Нёман. Дадзеная калекцыя захоўваецца ў фондах Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея пад нумарам КП 3447. Гэтыя матэрыялы часткова апрацоўваліся Міх. М. Чарняўскім. У 2024 г. дадзеная калекцыя знайшла сваё адлюстраванне ў "Каталозе калекцый крамянёвых артэфактаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея (1920–1941 гг.)" укладальнікам якога з'яўляецца А. Д. Гаршкоў.

Ключавыя словы: мезаліт, крэмень, прылады працы, Гродна.

Summary: The Berezhany monument was opened in 1909. It is most likely located on a low terrace on the left bank of the Neman river. This collection is stored in the funds of the Grodno State Historical and Archaeological Museum under the number KP 3447. These materials were partially processed by Mikh. M. Charnyawski. In 2024 this collection was reflected in the "Catalog of collections of flint artifacts of the Grodno State Historical and Archaeological Museum (1920–1941)" compiled by A. D. Gorshkov.

Key words: Mesolithic, flint, objects of labor, Hrodna.

Помнік Беражаны быў адкрыты ў 1909 г. Ю. Ядкоўскім, дзе пад час правядзення паверхневых збораў ім былі сабраны крамянёвыя і керамічныя артэфакты [9, с. 72–75]. Дадзеная калекцыя захоўваецца ў фондах Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея пад нумарам КП 3447. Гэтыя матэрыялы часткова апрацоўваліся М. М. Чарняўскім, апублікаваныя спісам М. М. Чарняўскім і Р. М. Акінчыцам [7, с. 10; 8, с. 3–8]. У 2024 г. дадзеная калекцыя знайшла сваё адлюстраванне ў "Каталозе калекцый крамянёвых артэфактаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея (1920-1941 гг.)" укладальнікам якога з'яўляецца А. Д. Гаршкоў [3, с. 11]. Таксама ўпамінаецца гэты помнік у абагульняючым выданні "Мезаліт Беларусі", дзе даецца сціплая характарыстыка матэрыялаў з паверхневых збораў Л. С. Клейна [4, с. 213]. Нягледзячы на публікацыю інфармацыі аб калекцыі, яна мае даведачная характар і не адлюстроўвае асноўныя тэхніка-марфалагічныя характарыстыкі матэрыялаў. Менавіта аналізу



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

артэфактаў з гэтага пункту гледжання і прысвечаны дадзены артыкул.

Як вышэй было ўзгадана, першыя вядомыя нам работы ў ваколіцах в. Беражаны (Гродзенскі раён) былі праведзены Ю. Ядкоўскім у 1909 г. У 1930-х гг. работы ў дадзенай мясцовасці праводзіў Я. Фіцке з мэтай пошуку рэшткаў могільніка, пра які ўзгадваў Ю. Ядкоўскі [6, с. 53]. У далейшым, работы ў ваколіцах дадзенай вёскі праводзіла ў 1958 г. Ф. Д. Гурэвіч. Яна лакалізавала ў 100–150 м уніз па цячэнні р. Нёмана, на высокім берагу селішча. Праведзеныя паверхневыя зборы ў развеяным культурным пласце дазволілі зафіксаваць фрагменты керамікі са слядамі нагару і дамешкамі жарствы [1, с. 156]. У гэтым жа годзе (верагодна, паралельна з Ф. Д. Гурэвіч) паверхневыя зборы былі праведзены Л. С. Клейнам у ваколіцах в. Беражаны, 1 км на поўнач, былі знойдзены разцы на зломе рэгулярных пласцін, канцавыя скрабкі (вызначэнне В. С. Абухоўскага). Дадзеныя артэфакты былі аднесены да кундская мезалітычнай культуры [3, с. 213]. У 1973–1975 гг. Я. Г. Звяругай каля вёскі, на паверхні была сабрана ляпная кераміка, глінянае праслiца і іншыя рэчы. Даследчык датаваў селішча сярэдзінай і другой паловай 1-га тысячагоддзя н.э., калекцыя захоўваецца ў аддзеле археалогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі [2, с. 150].

На дадзены момант на паўднёвай ускраіне в. Беражаны зафіксавана селішча канца жалезнага-ранняга сярэднявечча, якое ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (шыфр 413В000157). У 2021 г. пад час інвентарызацыі "Гісторыка-культурных каштоўнасцяў (помнікаў археалогіі) Гродзенскага раёна Гродзенская вобласці" А. Д. Гаршковым быў зафіксаваны стан помніка, а таксама былі праведзены паверхневыя зборы, у выніку якіх была сабрана калекцыя крамянёвых, керамічных артэфактаў і костак жывёл(?) [5, с. 12].

Нягледзячы на даволі значную гісторыю даследаванняў, праведзеных археалагамі ў ваколіцах в. Беражаны, на жаль, дакладна звязаць матэрыялы, якія былі назапашаны Ю. Ядкоўскім і захоўваюцца ў музеі з лакалізаваным зараз археалагічным помнікам нельга. Пагэтаму у дадзены артыкуле мы спынімся толькі на матэрыялах 1909 г.

Гэтая калекцыя археалагічных артэфактаў складаецца з 42 адзінак – 41 крамянёвых прадметы і 1 фрагмент (венчык) керамічнага кругавога начыння. Сярод каменных матэрыялаў можна вылучыць наступныя тэхніка-марфалагічныя групы: тэхналагічныя сколы і іх фрагменты; прадукты першаснага расшчаплення (дэбітаж); фармальныя прылады.

**Табліца № 1. Тэхніка-марфалагічная характарыстыка знаходак помніка Беражаны**

| Марфалагічная група | Катэгорыя | Колькасць | Усяго |
|---|---|---|---|
| Тэхналагічныя сколы | Фрагмент падрабрыстай пласціны рэтушаванай | 1 | 1 |
| Дэбітаж | Пласціны і іх фрагменты | 27 | 28 |
| | Адшчэп | 1 | |
| Фармальныя прылады | Пласціны і іх фрагменты з рэтушшу | 6 | 12 |
| | Фрагмент пласціны з выемкай | 1 | |
| | Разцы | 2 | |
| | Скрабок | 2 | |
| | Фрагмент яніславіцкага выстрыя (?) | 1 | |
| Разам: | | | 41 |

***Тэхналагічныя сколы і іх фрагменты*** (1 экз.). У калекцыі прысутнічае фрагмент падрабрыстай пласціны з другаснай апрацоўкай у выглядзе паўстромкай дасральнай рэтушшу. Памеры: даўжыня – 5,2 см; шырыня – 1 см; таўшчыня – 0,6 см.

***Прадукты першаснага расшчаплення*** (28 экз.). Дадзеная катэгорыя прадстаўлена адшчэпам і 27 пласцінамі і фрагментамі пласцін. Артэфакты маюць наступныя метрычныя параметры: даўжыня – 2 см; шырыня – 3,2 см; таўшчыня – 0,6 см (адшчэп); даўжыня (захаваная) – ад 2,35 да 4,4 см; шырыня – ад 0,9 да 1 см; таўшчыня – ад 0,2 да 0,4 см (пласціны і фрагменты пласцін).

***Фармальныя прылады*** (11 экз.) у даследуемай калекцыі прадстаўлены фрагментамі пласцін рэтушаваных, скрабкамі, фрагментам яніславіцкага вастрыя, разцамі.

*Фрагменты пласцін рэтушаваных (7 экз.).* Дадзеная група сфармавана 6 фрагментамі пласцін рэтушаваных і фрагментам пласціны з выемкай, якая была ўтворана паўстромкай рэтушшу. Памеры: даўжыня (захаваная) – ад 2,8 да 5 см; шырыня – ад 0,85 да 1,3 см; таўшчыня – ад 0,2 да 0,4 см.

*Скрабкі (2 экз.).* У калекцыі прысутнічае скрабок, канцавы, на пласціне. Працоўная частка сфармавана паўстромкай рэтушшу на дарсальнай паверхні. Яшчэ адзін экзэмпляр прадстаўлены двайной формай, на адшчэпе. Працоўная частка сфармавана паўстромкай і стромкай рэтушшу на дарсальнай паверхні. Памеры: даўжыня– 3,6/2,7 см; шырыня – 1,75/1,9 см; таўшчыня – 0,6/0,35 см.

*Разцы (2 экз.).* Дадзеная група ў калекцыі прадстаўлена двума разцамі бакавым і здвоеным на адным канцы, выкананых на зломах загатовак – пласцін. Памеры: даўжыня – 2,95/3,4 см; шырыня – 1,75/1,8 см; таўшчыня – 0,3/0,6 см.

Акрамя гэтага, у калекцыі прысутнічае фрагмент пласціны, з апрацаваным рэтушшу адным канцом і негатывам разцовага сколу. Дадзеныя характарыстыкі дазваляюць інтэрпрэтаваць гэты артэфакт як *фрагмент яніславіцкага вастрыя* (тыпу Велішаў). Памеры: даўжыня – 1,7 см; шырыня – 1 см; таўшчыня – 0,4 см.

Сыравіна. У асноўным крамянёвыя матэрыялы ў калекцыі быў зроблены з крэйдавага крэменю, светла-шэрага або цёмна-шэрага колеру, празрыстага на прасвет. Жаўлачная скарынка амаль адсутнічае. Падобныя выхады сыравіны фіксуюцца ў ваколіцах г. Гродна і па берагах р. Нёман у межах Гродзенскага ўзвышша.

Такім чынам на падставе тэхніка-марфалагічнай характарыстыкі даследуемую калекцыю можна звязваць з перыядам мезаліту. Выходзячы з набору дэбітажу і прылад якія намі былі апрацаваны, можна аднесці частку гэтых артэфактаў да яніславіцкай культуры. У далейшай перспектыве трэба працягнуць даследаванне помніка з дапамогай раскопак і даследавання навакольных тэрыторый для далейшага пошуку помнікаў мезалітычнага часу.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Гуревич, Ф. Д. Древности Белорусского понеманья / Ф. Д. Гуревич. – Москва-Ленинград, 1962. – С. 156.
2. Зверуга, Я. Г. Беражаны / Я. Г. Зверуга // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1986. – С. 150.
3. Каталог калекцый крамянёвых артэфактаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея (1920–1941 гг.) / уклад. А. Д. Гаршкоў. – [б.м.] :Издательские решения, 2024. – 60 с.
4. Калечыц, А. Г. Мезалітычныя помнікі Беларусі / А. Г. Калечыц, А. У. Коласаў. – Мінск : Беларус. навука, 2021. – 369 с.: іл.
5. Піваварчык, С. А. Справаздача аб выкананні навукова-даследчай работы «Инвентаризация историкокультурных ценностей (памятников археологии) Гродненского района Гродненской области» / С. А. Піваварчык, А. Д. Гаршкоў // Гродна, 2021. – 178 с.
6. Поболь, Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши / Л. Д. Поболь. Науч. ред. Ю. В. Кухаренко. – Минск : Наука и техника, 1979. – 108 с.
7. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб археалагічных работах, праведзеных Нёманскім неалітычным атрадам у 1987 г. / М. М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 1100. – 17 с., 17 іл., 40 с. кал. воп.
8. Чарняўскі, М. М., Старажытныя крамянёвыя вырабы ў зборах Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея / М. М. Чарняўскі, Р. М. Акінчыц // Краязнаўчыя запіскі: зб. да 75-годдзя заснавання ГДГАМ. Гродна, 1995. – С. 3–8.
9. Jodkowski, J. Poszukiwania archeologiczne w Berezanach pow. Augostowski / J. Jodkowski // Swiatowit. – 1907. – VIII. – S. 72–75.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 1. Крамянёвы інвентар з помніка Беражаны: 1 – фрагмент падрабрыстай пласціны рэтушаванай; 2-3, 5-6 – пласціны і іх фрагменты з рэтушшу; 4 – фрагмент пласціны з выемкай.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова